# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

16 МАЯ 1996 года чацвер

№9 (1745)


*Весткі з бібліятэкі*

## Дапамажыце і нам, і сабе!



Вясна! Хочацца размаўляць і пісаць аб чымсьці радасным, цудоўным. Ну, напрыклад, аб летніх канікулах, якія кожны студэнт чакае з вялікай нецярплівасцю. Але...

Канец навучальнага года дорыць нам не толькі радасць чакання будучага адпачынку. З годнасцю вытрымаць экзаменацыйную сесію — вось што галоўнае! І гэтага яшчэ не дастаткова.

Заглянем у нашу бібліятэку. Абанемент абслугоўвання вучэбнай літаратурай заўжды рады вітаць Вас у сваіх сценах. Супрацоўнікі бібліятэкі ва ўсім дапамогуць Вам, але... Вы добра ведаеце, што напрыканцы кожнага навучальнага года ўсе павінны разлічыцца з бібліятэкай. На жаль, не ўсе студэнты універсітэта прытрымліваюцца гэтага правіла. Многія з вас цягнуць да апошняга, калі ўжо стаяць на абанеменце вялізныя чэргі і абслугоўваюць вас ужо не добрыя прывабныя дзяўчыны, а стомленыя, сагнутыя пад цяжарам здадзенай літаратуры бібліятэкаркі.

Напэўна, ніхто з вас не ўяўляе сабе, колькі літаратуры мы павінны прыняць у фонд гэтым летам.

Увосень 1995 года было выдадзена 57396 экземпляраў кніг. Да гэтай лічбы трэба прыплюсаваць яшчэ тую літаратуру, якую кожны з вас дабіраў на працягу ўсяго навучальнага года.

Таму мы чакаем ад Вас сумленнасці. Дапамажыце і нам, і сабе. Тым болей, што ў наступным навучальным годзе даўжнікі апынуцца ў незайздросным становішчы. Бібліятэка збіраецца прыняць строгія меры да іх. Акрамя гэтага, не трэба забываць аб тым, што ў той час, калі падручнікі дарэмна пыляцца ў Вас дома, яны так неабходныя іншым чытачам.

Асобна хочацца звярнуцца да выпускнікоў універсітэта. Ад радасці яны не памятаюць аб тым, што шлях да атрымання дыплома ляжыць праз бібліятэку. Не адкладайце тое, што можна зрабіць ужо сёння. І тады Вам не трэба будзе траціць свае нервы на пошукі згубленай літаратуры, а потым бегаць з апошні дзень з абходным лістом па ўсіх аддзелах універсітэта.

Да сустрэчы ў бібліятэцы!

*Супрацоўнік аддзела абслугоўвання вучэбнай літаратурай бібліятэкі А.П.Кібкала*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Загадчыкаў кафедраў: сусветнай і айчыннай гісторыі, эканамічнай тэорыі, філасофіі і метадалогіі навукі;

Дацэнтаў кафедраў: вылічальнай матэматыкі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, псіхалогіі;

Старшых выкладчыкаў кафедраў: тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, тэорыі літаратуры, раманскіх моў;

Выкладчыкаў кафедраў: раманскіх моў, псіхалогіі, славістыкі;

Асістэнта кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў.

Тэрмін конкурсу -- адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 16 мая 1996 года.

## *Запрашае Вязынка*

Сёлетні студэнцкі фестываль "Белдзяржуніверсітэт-96", які традыцыйна пройдзе 18-19 мая ў Вязынцы, прысвечаны 75-й гадавіне БДУ. Удзельнікаў чакае цікавая праграма.

18 мая, субота

9.00 Ад'езд у Вязынку камандаў факультэтаў, гасцей фестывалю. Стварэнне палатачнага гарадка. Знаёмства з музеем-запаведнікам.

13.00 Конкурс паходнай кухні, мініфутбол, перацягванне канату, гіра, спартыўнае арыентаванне, эстафета, конкурс візітовак факультэтаў, прэс-канферэнцыя адміністрацыі БДУ, аукцыён. Культурная праграма, дыскатэка да світанку.

19 мая, нядзеля

Сустрэча світанку. Прыборка тэрыторыі лагера. Ад'езд гасцей фестывалю. Ад'езд камандаў факультэтаў.



*З 26 красавіка па 14 мая ў галерэі сучаснага мастацтва "Шостая лінія" прайшла выстава фотамастака Уладзіміра Блінова "Пасля Чарнобыля". Аўтар, які працуе ў Інстытуце заалогіі Акадэміі навук Беларусі, прадставіў свае фотаздымкі з 30-кіламетровай зоны, зробленыя ў 1989-1995 гадах. Выстава прайшла пры падтрымцы Беларускага Фонду Сораса.*

## *З 20 красавіка пачалася падпіска на газеты і часопісы на другое паўгоддзе 1996 года*

У часопіса "Веснік БДУ" традыцыйна самая нізкая падпісная цана.

Серыя 3, № 2 (ліпень) — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (інд. 74853) — 15 тысяч рублёў;

Серыя 4, № 2 (жнівень) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (інд. 74854) — 15 тысяч рублёў;

Серыя 1, № 3 (верасень) — фізіка, матэматыка, механіка (інд. 74851) — 15 тысяч рублёў;

Серыя 2, № 3 (кастрычнік) — хімія, біялогія, геаграфія (інд. 74852) — 15 тысяч рублёў;

Серыя 3, № 3 (лістапад) — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (інд. 74853) — 15 тысяч рублёў;

Серыя 4, № 3 (снежань) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (інд. 74854) — 15 тысяч рублёў.

Падпіска на часопіс "Веснік БДУ" прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі і пунктах падпіскі "Белсаюздруку".

У розніцу ў продаж часопіс не паступае.

*Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса*

## *Не праміньце! Дні ММФ (механіка-матэматычнага факультэта) — 96*

У праграме:

— традыцыйныя забавы (казіно, ЗАГС, бар, спіртлато, прэс-канферэнцыя...),

— нечаканыя сюрпрызы,

— шмат прызоў — усё самае цікавае.

*25 мая а 10 гадзіне запрашаем Вас на ганку ў дворык галоўнага корпуса БДУ.*

*ДАІ паведамляе*

За 4 месяцы 1996 года па Мінску адбылося 205 ДТЗ, у якіх загінула 30, паранены 202 чалавекі. За гэты перыяд па Маскоўскаму раёну адбылося 22 ДТЗ, у якіх загінулі 2, паранены 13 чалавек.

У двух ДТЗ вадзіцелі-парушальнікі з'ехалі, не аказаўшы дапамогі пацярпелым.

Рана ці позна парушальнікаў Правілаў дарожнага руху насцігне пакаранне. Лепей выконвайце ПДР, а не парушайце іх!

*Інспектар па арганізацыі дарожнага руху маёр А.Кавальчук*

*Віншуем!*

Народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну было нададзена званне ганаровага доктара Белдзяржуніверсітэта. Віншуем Рыгора Іванавіча і зычым далейшых творчых поспехаў!

*Савет ветэранаў БДУ дзякуе рэктарату, прафкаму, аддзелу па справах моладзі, дырэкцыі па справах культуры Белдзяржуніверсітэта за цёплыя прывітанні ў сувязі з чарговай гадавінай Перамогі.*



*У кітайскай групе ідуць заняткі рускай мовы. Выкладчык — Родзіна Алена Іванаўна.*

# Калектыўны дагавор прафсаюзнага Беларускага дзяржаўнага

Раздзел I

***Агульныя палажэнні.***

1.1. Гэты калектыўны дагавор заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам.

Калектыўны дагавор заключаецца тэрмінам на тры гады і ўступае ў дзеянне з моманту падпісання яго абодвума бакамі. Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавору з'яўляецца сацыяльнае партнёрства і раўнапраўе бакоў.

Прынятыя палажэнні дагавору распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву, якія з'яўляюцца членамі прафсаюза адукацыі і навукі.

Адміністрацыя абавязуецца знаёміць з калектыўным дагаворам кожнага, хто паступае на работу. Адміністрацыя і прафкам абавязуецца праз месяц з дня прыняцця дагавору памножыць яго і давесці да ўсіх службаў універсітэта і прафсаюзных арганізацый.

1.2. Адміністрацыя, у асобе рэктара універсітэта, і прафсаюзны камітэт, у асобе старшыні прафкама, абавязуецца забяспечыць бесперапынны кантроль за выкананнем усіх дамоў дагавору.

1.3. Справаздачы аб ходзе выканання калектыўнага дагавору заслухоўваюць раз у паўгода на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкама з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафкам універсітэта праводзіць на канферэнцыі прадстаўнікоў працоўнага калектыву.

1.4. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца інфармаваць супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага абсталявання, прэміраванне і г.д.

1.5. Бакі абавязуюцца ў выпадку ўзнікнення калектыўных працоўных спрэчак прымаць неабходныя меры для вырашэння іх шляхам перамоў на падставе ўзаемнай павагі і даверу пагаджальным спосабам.

1.6. Рашэнні, прымаемыя канферэнцыяй прадстаўнікоў працоўнага калектыву універсітэта, з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх членаў працоўнага калектыву.

1.7. Пры невыкананні палажэнняў калектыўнага дагавору, паўторным парушэнні тэрмінаў выканання абавязацельстваў прафкам, канферэнцыя прадстаўнікоў працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе адказнага выканаўцы.

1.8. Бакі абавязуюцца стварыць камісію па кантролю за выкананнем калектыўнага дагавору ў колькасці 6-х чалавек: па 3 прадстаўнікі з кожнага боку.

Раздзел 2

***Арганізацыя працы, нарміраванне, аплата працы, заключэнне і скасаванне працоўных дагавораў.***

2.1. Распрацаваць і ўвесці ў дзеянне з 1 верасня 1995 года Правілы ўнутранага працоўнага распарадку Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Рэктарат, агульна-прававы аддзел, аддзел кадраў.

2.2. Адміністрацыя універсітэта будзе ажыццяўляць раўнамерную загрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускаць больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай пасадзе, 9 гадзін з улікам сумяшчальніцтва, правядзення не больш аднаго экзамена ў дзень.

Работу ў выхадныя дні дазваляць у выключных выпадках, афармленне не праводзіць у адпаведнасці з КЗаП па заяве выкладчыка.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў, заг.кафедраў.

2.3. У мэтах паляпшэння ўмоў працы, санітарна-гігіенічнага стану памяшканняў, вучобы студэнтаў, рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта перагледзець загад аб замацаванні за факультэтамі і адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі аўдыторнага фонду з улікам аб'ёму і відаў вучэбнай нагрузкі.

Адк.: Вучэбна-метадычнае ўпраўленне, дэканы факультэтаў. Штогод, да верасня.

2.4. Устанавіць аб'ём вучэбнай нагрузкі і разліку на выкладчыка у сярэднім 700 гадзін, пры тым, лекцыйна-семінарская нагрузка павінна быць не менш 130 гадзін. Перавыкананне вучэбнай нагрузкі аплочваць ва ўстаноўленым парадку ў межах пагадзіннага фонду факультэта ці агульнаўніверсітэцкай кафедры. Да ўдакладнення сярэдняй вучэбнай нагрузкі звяртацца штогод у верасні з улікам прапаноў вучэбна-метадычнага ўпраўлення.

Адк.: Рэктарат, вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.5. Дазволіць штатным супрацоўнікам БДУ па ініцыятыве кафедры выкананне пагадзіннай вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі пры адсутнасці работы па сумяшчальніцтву на іншых пасадах і да 240 гадзін пры наяўнасці работы па сумяшчальніцтву.

Адк.: Дэканы факультэтаў, вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.6. Забяспечыць захаванне ўсталяванага парадку і дысцыпліны ўсімі супрацоўнікамі і студэнтамі.

Да студзеня кожнага года распрацоўваць і выдаваць вытворчы каляндар універсітэта на чарговы год.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў. На працягу ўсяго тэрміну дзеяння дагавору.

2.7. Да 01.09.1995 г. падрыхтаваць і выдаць нарматыўны дакумент аб забароне курэння ў вучэбных карпусах універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.8. Захаваць ў адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння пасад. З асобамі пенсійнага ўзросту, у якіх закончыўся тэрмін выбрання на пасаду, дазволіць адміністрацыі заключаць працоўныя дагаворы на вучэбны год.

Адк.: Аддзел кадраў, дэканы факультэтаў.

2.9. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1995-1996 навучальным годзе не больш за 36 гадзін у тыдзень.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў.

2.10. Звальненне супрацоўнікаў, па скарачэнні колькасці супрацоўнікаў штатаў работнікаў не дапускаецца, калі магчымы перавод з іх згоды на іншыя вакантныя пасады.

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

2.11. Пры скарачэнні колькасці ці штату супрацоўнікаў пераважныя правы ў астаўленні на працы ў выпадку роўнай кваліфікацыі аддаецца (апрача катэгорый, пералічаных у арт. 34 КЗаП) супрацоўнікам, якія з'яўляюцца адзінымі кармільцамі ў сям'і, маюць больш працяглы тэрмін працы ў універсітэце.

Адк.: Аддзел кадраў, кіраўнікі факультэтаў, аддзелаў і службаў.

2.12. Скасаванне працоўнага дагавору па ініцыятыве адміністрацыі па п.п. 1,2,5 арт. КЗаП Беларусі праводзіць з папярэдняй згодай прафкама, па п. 3, 4, 7, 8 арт. п. 2, 3 арт. 254 КЗаП РБ — пасля папярэдняга, не раней, чым за два тыдні, паведамлення прафкама.

Адк.: Аддзел кадраў.

2.13. Прадаставіць адміністрацыі права афармлення на работу грамадзян пенсійнага ўзросту на ўмовах тэрміновага дагавору.

Адк.: Рэктарат, старшыня прафкама, аддзел кадраў.

2.14. Пры своечасовым фінансаванні аплату працы праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 4 па 6 (разлік) і з 16 па 18 (аванс) даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Кожны квартал даводзіць да ведама падраздзяленняў аб дэпаніраваных выплатах (сумах).

Выплату стыпендыі студэнтам і аспірантам ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 22 па 24 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні папярэднія ім.

Выдачу разліковых лістоў ажыццяўляць па ўсіх відах заработнай платы.

Адк.: Галоўны бухгалтар, дэканы факультэтаў, дырэктар ІВЦ.

2.15. Пры недастатковым фінансаванні аплаты працы ў падраздзяленнях навукова-даследчай часткі прадаставіць адміністрацыі права пераводзіць супрацоўнікаў па іх асабістай заяве на няпоўны рабочы дзень, на няпоўны рабочы тыдзень, з зарплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу ці прадстаўляць ім адпачынак (неаплочваемы) тэрмінам да 3 месяцаў.

Адк.: Аддзел кадраў, навукова-даследчая частка, галоўны бухгалтар.

2.16. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца адстойваць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт. 34 Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Адк.: Рэктарат, прафкам, пастаянна.

2.17. Распрацаваць і ўвесці ў дзеянне з 1 кастрычніка 1995 года Палажэнне аб Заслужаным прафесары Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, вучэбна-метадычнае ўпраўленне, аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, прафкам.

2.18. Распрацаваць у тэрмін да 1 чэрвеня 1995 года і зацвердзіць Прыкладнае палажэнне аб прэміраванні супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, бухгалтэрыя, прафкам.

2.19. Распрацаваць у тэрмін да 1 чэрвеня 1995 года і ўвесці ў дзеянне Палажэнне аб матэрыяльным заахвочванні супрацоўнікаў універсітэта за распрацоўку вучэбных планаў.

Адк.: Вучэбна-метадычнае ўпраўленне, агульна-прававы аддзел, прафкам.

2.20. Своечасова даводзіць да ведама супрацоўнікаў універсітэта новыя стаўкі заработнай платы, змены ва ўмовах аплаты працы.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел.

2.21. Даплаты спецыялістам і служачым могуць устанаўлівацца за сумяшчэнне абавязкаў часова адсутнічага супрацоўніка (хвароба, дэкрэтны водпуск па ўходу за дзіцем да 3-х гадоў, працягляя камандзіроўка) і па рабочых пасадах з аплатай да 100%.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, агульна-прававы аддзел.

2.22. Запаўненне вакантных пасад уборшчыкаў, дворнікаў, гардэробшчыц, можа праводзіцца па сумяшчальніцтву на поўную стаўку.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел. Пастаянна.

2.23. Для супрацоўнікаў, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, усталёўваецца пяцідзённы працоўны тыдзень, які складае 40 гадзін. Пачатак работы з 8.30, заканчэнне у 17.30. Перапынак на абед — з 13.00 па 14 гадзін. У перадсвяточныя дні працоўны дзень заканчваецца ў 16.30.

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел, аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі.

2.24. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу усталёўваецца шасцігадзінны працоўны дзень, у межах якога выкладчыкі павінны выконваць усе віды вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы.

Адк.: Дэканы факультэтаў.

2.25. Разглядаць скаргі і канфліктныя сітуацыі і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўлены тэрмін.

Адк.: Прафкам.

2.26. Забяспечыць галоснасць і нагляднасць аб мерах заахвочвання за добрасумленную працу і дысцыплінарнага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага парадку.

Адк.: Прафкам, рэктарат. Пастаянна.

Раздзел 3

***Паляпшэнне сацыяльна-эканамічных умоў, прадстаўленне льгот асобным катэгорыям супрацоўнікаў.***

3.1. Адміністрацыя і прафкам універсітэта абавязуецца выканаць усю неабходную работу ў 1995 годзе дзеля пачатку будаўніцтва на падставе дагавору дома па вул. Аэрадромнай.

3.2. Прадстаўленне жылой плошчы пры ўмове выдзялення ажыццяўляць у адпаведнасці са спісам чаргі на атрыманне жылля і ільготным спісам супрацоўнікаў.

Пастаноўку на ўлік у чаргу для забеспячэння жылой плошчай ажыццяўляць сумесным рашэннем рэктара і прафкама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і нарматыўнымі актамі.

Адк.: Рэктарат, прафкам, дэканаты.

3.3. Супрацоўнік, які аднойчы атрымаў кватэру ад універсітэта, можа разглядацца паўторна на паляпшэнне жыллёвых умоў толькі ў выпадку перадачы займаемай кватэры універсітэту для паўторнага засялення.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

3.4. Па меры фарміравання фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця БДУ выдзеліць з гэтага фонду не менш 10 млн. рублёў для частковай аплаты пуцёвак у лагеры аздараўлення дзяцей.

Адк.: Галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

3.5. Аплочваць 1 раз у тры гады са сродкаў сацыяльнага страхавання санаторныя пуцёўкі, якія выдаюцца супрацоўнікам універсітэта, у памеры 90% ад іх кошту.

Адк.: Галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

3.6. Дазволіць кіраўнікам структурных падраздзяленняў універсітэта ў адпаведнасці з арт. 167(2) КЗаП Рэспублікі Беларусь, прадастаўляць працоўным жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 16 год, адзін раз у месяц дадатковы выхадны з захаваннем заработнай платы. Штомесячны дадатковы выхадны дзень пераносу на наступны месяц не падлягае.

Адк.: Кіраўнікі структур-

# камітэта і адміністрацыі універсітэта

ных падраздзяленняў.

3.7. Жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 год, прадастаўляць па іх заяве дадатковы неаплачваемы водпуск па догляду за дзіцем з захаваннем месца работы (пасады).

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.

3.8. У адпаведнасці з арт. 76 КЗаП РБ прадаставіць права адміністрацыі даваць неаплочваемы адпачынак працягласцю да аднаго месяца асобам вучэбна-дапаможнага і абслугоўваючага персаналу ў ліпені-жніўні кожнага года.

Адк.: Рэктарат.

3.9. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам матэрыяльную дапамогу (з фонду сацыяльнай дапамогі рэктара і прафкама).

Адк.: Рэктарат, старшыні прафкамаў.

3.10. Пры прадстаўленні супрацоўнікам чарговага адпачынку выплочваць дапамогу ў памеры, які залежыць ад памераў эканоміі фонду аплаты працы.

Адк.: Рэктарат.

3.11. Выплочваць аднаразовую дапамогу:

— пры выхадзе супрацоўніка на пенсію па асабістай заяве ў памеры месячнага акладу па займаемай пасадзе, у які ўваходзіць і двухтыднёвая выхадная дапамога;

— сям'і памершага супрацоўніка, а таксама пры смерці блізкіх сваякоў (бацькі, дзеці) у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і ў памеры ад фінансавых магчымасцей БДУ.

3.12. Забяспечыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў усіх формаў навучання згодна з планамі факультэтаў.

Адк.: Дэканы факультэтаў.

3.13. Павышаць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выстаў у бібліятэцы.

Адк.: Дырэктар бібліятэкі, аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі.

3.14. Садзейнічаць выхаду ў свет заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

Адк.: Рэктарат.

3.15. Камандзіроўкі ў замежныя ВНУ і фірмы (стажыроўка, вучоба) афармляць толькі пры наяўнасці грашовых сродкаў, а для навуковай працы — пры наяўнасці сродкаў па адпаведнай навуковай тэме кафедры на аснове рэкамендацый вучоных саветаў факультэтаў; у выпадку асаблівай тэрміновасці — па рэкамендацыі дэканаў з наступным зацвярджэннем на вучоных саветах.

Адк.: Дэканы факультэтаў, начальнік упраўлення замежных сувязей.

3.16. Па дамоўленасці бакоў адміністрацыя можа прадстаўляць супрацоўнікам дадатковы адпачынак без захавання заработнай платы ў вольны ад заняткаў час тэрмінам ад 3 да 30 календарных дзён, у тым ліку ў наступных выпадках:

— уступленне ў шлюб — 3 дні

— пахаванне блізкіх родзічаў — 3 дні (без уліку дарогі).

Адк.: Рэктарат, прафкам.

3.17. У адпаведнасці з арт. 199 КЗаП Рэспублікі Беларусь супрацоўнікам універсітэта, якія паспяхова спалучаюць працу з вучобай у вячэрніх і завочных ВНУ або ССНУ, прадастаўляюцца мінімальныя ільготы, прадугледжаныя арт. 200-204 КЗаП РБ.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

### Раздзел 4

***Ахова працы. Умацаванне здароўя, арганізацыя адпачынку супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў.***

4.1. Забяспечыць супрацоўнікаў універсітэта, працуючых у шкодных умовах, ільготамі згодна з дзеючым заканадаўствам.

Адк.: Камісія універсітэта, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, аддзел аховы працы і ТБ. Пастаянна.

4.2. Забяспечыць бясплатную выдачу малака ўборшчыкам памяшканняў і супрацоўнікам кнігасховішча бібліятэкі пры наяўнасці фінансавых сродкаў на гэтыя мэты.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, прафкам. Пастаянна.

4.3. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў па ахове працы і супрацьпажарнай прафілактыцы, рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў бяспекі супрацоўнікамі, занятымі на работах з павышанай небяспекай.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

4.4. Забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам і мыючымі і ахоўнымі сродкамі ў адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі.

Адк.: Аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, аддзел аховы працы і ТБ, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

4.5. Перыядычна праводзіць аналіз паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, даваць ацэнку эфектыўнасці работы вентыляцыйных установак, праводзіць замеры асвятляльнасці рабочых месцаў, тэмпературнага рэжыму ў лабараторыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях.

Адк.: Галоўны інжынер, аддзел аховы працы і ТБ, лабараторыя службы радыяцыйнай бяспекі.

4.6. Асаблівую ўвагу звярнуць на ўмовы арганізацыі працы супрацоўнікаў бібліятэкі, працуючых у кнігасховішчы. Падрыхтаваць да 1 чэрвеня 1995 хадайніцтва ў Мінадукацыі РБ і Камітэт галіновага прафсаюза аб магчымасці скарачэння на 1 гадзіну працоўнага дня для гэтай катэгорыі супрацоўнікаў з захаваннем аплаты працы.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, дырэктар бібліятэкі, прафкам, рэктарат.

4.7. Скараціць да мінімума колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, выключыць адпаведныя заняткі для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адк.: Загадчыкі кафедраў, прафбюро факультэтаў.

4.8. Забяспечыць бесперапынную работу ўсіх кропак грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) універсітэта. Дабівацца паляпшэння якаснага прыгатавання страў.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.9. Аказваць за кошт пазабюджэтных сродкаў фінансавую дапамогу сталовай для арганізацыі грамадскага харчавання студэнтаў і супрацоўнікаў.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.10. Ажыццяўляць рэгулярны кантроль за работай сталовых, буфетаў і кафэ ў мэтах паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў і якасці прыгатавання ежы.

Адк.: Прафкам.

4.11. Забяспечыць адкрыццё з 1 верасня 1995 года на базе стала заказаў фірменага прадуктовага магазіна ад Аляхновіцкай птушкафабрыкі.

Адкрыць філіялы магазіна на факультэце радыёфізікі і электронікі, геаграфічным факультэце і філалагічным факультэце. Да 1 верасня 1995 года.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.12. Забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта ільготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта.

Адк.: Прафкам.

4.13. Арганізаваць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак, выдаткаваных абкамам прафсаюза на:

— санаторна-курортнае лячэнне;

— адпачынак па пуцёўках міжнароднага турызму;

— адпачынак дзяцей супрацоўнікаў у дзіцячых лагерах.

Адк.: Прафкам.

4.14. Забяспечыць фінансаванне груп здароўя ў адпаведнасці з каштарысам прафкама.

Адк.: Прафкам.

4.15. Аказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных мясцінах, асабліва ў час адпачынку.

Адк.: Прафкам.

4.16. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.

Адк.: Прафкам.

4.17. Праводзіць урачыстыя вечары, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечарыны, творчыя справаздачы народных калектываў, выставы народнай творчасці.

Адк.: Прафкам.

4.18. Удасканальваць сістэму аздараўлення супрацоўнікаў універсітэта. Наладзіць улік чаргі тых, хто мае патрэбу ў лячэнні.

Адк.: Прафкам.

4.19. З улікам экалагічнай абстаноўкі і ў мэтах своечасовага выяўлення захворванняў штогод праводзіць медыцынскую дыягностыку ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.

Адк.: Прафкам.

*Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта акадэмік АН Беларусі Ф.М.Капуцкі*

*Старшыня прафкама супрацоўнікаў ст.навуковы супрацоўнік А.В.Паўлаў*

# Дадаткі і змяненні

### Раздзел 2

2.8. Даць у наступнай рэдакцыі: "Захаваць у адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння пасад незалежна ад узросту. З асобамі пенсійнага ўзросту дазволіць адміністрацыі заключаць кантракты толькі пасля заканчэння тэрміну выбрання на пасаду".

2.11. Дадаць: "Тым, хто павышае сваю кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці ў аспірантуры, у вышэйшых у сярэдніх спецыяльных навучальных установах; работнікам, якім засталося да выхаду на пенсію па ўзросту не больш 2 гадоў".

2.12. Даць у наступнай рэдакцыі: "Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка па арт. 33 п.п. 1, 2, 5 КЗаП РБ рабіць толькі з папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў універсітэта. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве адміністрацыі па іншых падставах рабіць пасля папярэдняга, не пазней чым за 2 тыдні, паведамлення прафсаюзнаму камітэту супрацоўнікаў".

### Раздзел 3

3.2. Дадаць: "Прызнаць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў супрацоўнікаў, якія прапрацавалі ва універсітэце больш 20 гадоў, маюць высокія дасягненні ў працы і менш 8 кв.м на кожнага члена сям'і".

***Дадаць новыя пункты:***

3.18. Прадаставіць адміністрацыі права павялічваць працягласць аплачваемага водпуску штатным супрацоўнікам НДЧ, якія працуюць у падраздзяленнях, забяспечаных фінансаваннем, маюць вучоную ступень доктара навук — да 48 працоўных дзён, кандыдата навук — да 36 працоўных дзён.

3.19. Ва універсітэце прымяняюцца наступныя віды матэрыяльнай зацікаўленасці:

Рэктарам

1. Узнагароджанне каштоўным падарункам;
2. Выдача грашовай прэміі;
3. Абвяшчэнне падзякі і выдача грашовай дапамогі;
4. Узнагароджанне Ганаровай граматай і выдача грашовай дапамогі.

Рэктарам сумесна з прафкамам ажыццяўляецца:

1. Прадстаўленне да ўзнагароджання Міністэрствам адукацыі і навукі РБ;
2. Прадстаўленне да ўзнагароджання Урадам і Вярхоўным Саветам РБ.

### Раздзел 4

***Дадаць пункты:***

4.20. Рэгулярна аказваць матэрыяльную дапамогу шматдзетным сем'ям (якія маюць 4-х і больш дзяцей).

4.21. Стварыць медыцынскі пункт у корпусе па вул. Бабруйскай, 9 для аказання медыцынскай дапамогі першай неабходнасці супрацоўнікам універсітэта.

4.22. Дазволіць адміністрацыі ўводзіць у структуру адміністратыўна-кіраўнічага апарату (АК) пасады, якія адпавядаюць адукацыйнаму ўзроўню і вопыту работы супрацоўнікаў.

**Дадаць "Раздзел 5. Прававыя гарантыі дзейнасці прафкама і яго прафактыву".**

5.1. Рэктарат абавязваецца:

5.1.1. Даваць прафкаму інфармацыю, якая неабходна для вядзення калектыўных перагавораў і рэалізацыі правоў прафсаюза па абароне працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў супрацоўнікаў.

5.2. Прафкам абавязваецца:

5.2.1. Праводзіць навучанне прафактыву па пытаннях працоўнага заканадаўства, аховы працы, сацыяльнага страхавання, заробкавай працы.

5.3. Прафсаюзныя актывісты — члены абраных прафсаюзных органаў вызваляюцца ад асноўнай працы для ўдзелу ў рабоце з'ездаў, канферэнцый, пленумаў і іншых статутных мерапрыемстваў, а таксама кароткатэрміновай прафсаюзнай вучобы з захаваннем сярэдняга заробку. Ім даецца свабодны час для выканання грамадскіх абавязкаў на карысць калектыву.

5.3.2. Абраным прафсаюзным работнікам пасля сканчэння іх паўнамоцтва на выбарчай пасадзе даецца магчымасць працаваць на папярэднім месцы працы (пасадзе), а пры яе адсутнасці, са згоды работніка,— другая раўназначная работа (пасада).

5.3.3. Захоўваецца існуючы парадак платы прафсаюзных узносаў шляхам пералічэння праз бухгалтэрыю універсітэта.

5.3.4. Наймальнікам забяспечваюцца матэрыяльныя ўмовы для дзейнасці прафкама (прадстаўленне памяшканняў без аплаты, аргтэхнікі, канцтавараў, паперы, сродкаў сувязі і г.д.).

5.3.5. Звальненне па ініцыятыве адміністрацыі, а таксама прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці асоб, абраных у састаў прафкама універсітэта, прафсаюзных бюро і прафгруп і не вызваленых ад вытворчай працы, дазваляецца з папярэдняй згоды прафкама універсітэта.

5.3.6. Вызваленыя прафсаюзныя работнікі з'яўляюцца раўнапраўнымі членамі працоўнага калектыву універсітэта і карыстаюцца ўсімі правамі і ільготамі аднолькава з імі.

# Факсімільныя выданні ў бібліятэцы БДУ

У аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі фундаментальнай бібліятэкі экспануецца выстава "Факсімільныя выданні ў бібліятэцы БДУ".

На працягу многіх стагоддзяў па розных прычынах (час, войны, прыродныя ўмовы і з'явы, гістарычныя і палітычныя катаклізмы) гіне вялікая колькасць кніжных багаццяў. Каб зберагчы ацалелыя выданні, якія маюць гістарычную, навуковую і культурную каштоўнасць і прадастаўляць іх бібліятэкам, музеям, асабістым уладальнікам, у выдавецтвах свету выкарыстоўваецца факсіміліраванне выданняў.

Слова факсіміле — ад лацінскага fac simile — рабі падобнае.

Факсімільнае выданне — гэта дакладнае ўзнаўленне арыгіналу старадаўніх кніг (рукапісаў, інкунабулаў), кніжных рарытэтаў, якія засталіся ў адным экземпляры ці выдадзены малым тыражом, узнаўляючы пры гэтым асаблівасці пераплёту, якасці паперы, прыметы старэння, мастацкае афармленне і розныя паметы выдання.

Факсімільна могуць выдавацца рукапісы, кнігі, газеты, часопісы, артыкулы.

Факсімільныя выданні звычайна забяспечваюцца даведачным і навуковым апаратам (прамова, пасляслоўе, каментарый з кароткім суправаджальным артыкулам), што пішуць вядомыя дзеячы навукі і культуры.

Гісторыя выпуску факсімільных выданняў налічвае каля двух стагоддзяў. Выпускаюць факсімільныя выданні, у асноўным, да юбілейных і знамянальных дат.

На выставе, дзе экспануецца каля 70 факсімільных выданняў, Вы зможаце ўбачыць выданні вядомых выдавецтваў былога СССР і рэспублікі Беларусь, выданні класічнай рускай, беларускай і замежных літаратур, якія афармляліся мастакамі XI, XIV-XVI, XIX і XX стагоддзяў на старажытнарускай, царкоўнаславянскай, рускай, беларускай, украінскай і іншых мовах, вялікія фаліянты і маленькія кніжачкі. Кожнае з гэтых выданняў мае сваю гісторыю і непаўторны шлях.

Так у 1983 годзе выдавецтвам "Кніга" была ўзноўлена факсімільным выданнем рукапісная кніга "Ізборнік Святаслава 1073 года" -- помнік культуры трох народаў: рускага, украінскага і беларускага. Арыгінал (па фармату вялікі), які паслужыў матэрыялам для дадзенага выдання, захоўваецца ў Дзяржаўным Гістарычным музеі ў Маскве ў аддзеле рукапісных і старадрукаваных кніг. "Ізборнік Святаслава 1073 года" — адзін з першых зборнікаў энцыклапедычнага характару. Сёння ён прыцягвае да сябе ўвагу многіх даследчыкаў у галіне гісторыі, палеографіі, літаратуры, мовазнаўства, філасофіі, бо змяшчае ў сабе інфармацыю аб розных баках жыцця старажытнай Русі. "Ізборнік" напісаны прыгожым, строгім рускім уставам з усімі яго асаблівасцямі. Гэта адзін з нямногіх рукапісных помнікаў часу стаўлення рускай кніжнай традыцыі. Яго незвычайнае мастацкае ўбранства заслугоўвае асаблівай увагі. Своеасаблівасць арнаментальных і каларыстычных мініяцюр, заставак, ініцыялаў — усё гэта адлюстроўвае надзвычайную эпоху старажытнай культуры ўсходнеславянскіх народаў, у якой ён ствараўся. Выдавецтва "Аўрора" (Ленінград) у 1988 годзе ўзнаўляе факсімільным выданнем вядомую рукапісную кнігу "Астраміраве Евангелле", арыгінал якой захоўваецца ў Дзяржаўнай Публічнай бібліятэцы імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына ў аддзеле рукапісаў і рэдкіх кніг.

"Астраміраве Евангелле" было напісана ў 1056-1057 гадах на пергаменце і змяшчае ў сабе 294 старонкі прыгожага ўставнога пісьма ў два слупкі. Гэта Евангелле апракас (павінна азначаць нядзельнае, гэта значыць размеркаванне па нядзелях, пачынаючы з Вялікадня) напісанае на царкоўнаславянскай мове ў Ноўгарадзе для пасадніка Астраміра дыяканам Рыгорам (Григорием). "Астраміраве Евангелле", як і "Ізборнік Святаслава 1073 года", — выдатны помнік старажытнаславянскай пісьмовасці. Цяжка пераацаніць значэнне гэтых дзвюх найстаражытнейшых рукапісных кніг, якія так многа значаць для навукі, для славістыкі і для гісторыі культуры.

У 1985 годзе выдавецтва "Кніга" выпускае факсімільнае ўзнаўленне вядомага твору рускага сярэднявечча "Сказание о Борисе и Глебе", а ў 1986 годзе гэтым жа выдавецтвам ўзнаўляецца факсімільна другі вельмі вядомы твор гэтага часу "Повесть о Зосиме и Савватии".

Усе вышэйназваныя факсімільныя выданні маюць навукова-даведачны апарат.

Да 400-годдзя (1574-1974) першага рускага падручніка "Азбука" Івана Фёдарава выдавецтва "Асвета" (Масква) выпусціла ў 1974 годзе яго мініяцюрна-факсімільнае выданне, выдавецтва "Мастацкая літаратура" (Масква) ажыццявіла выпуск факсімільнага выдання кнігі "Юности честное зерцало", арыгінал якога (1717 года выдання) захоўваецца ў Дзяржаўнай Нацыянальнай расійскай бібліятэцы ў Маскве.

Увогуле ў 80-я гады нашага стагоддзя дзяржаўнымі выдавецтвамі горада Масквы і Ленінграда было факсімільна ўзноўлена шмат твораў рускай класічнай літаратуры, якія афармляліся вядомымі мастакамі XIX і пачатку XX стагоддзяў.

Так, у 1985 годзе выдавецтва "Кніга" факсімільна ўзнаўляе "Материалы для биографии А.С.Пушкина. Издание П.В.Анненкова 1855 года".

У 1987 годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" ажыццяўляе факсімільнае выданне паэмы А.С.Пушкіна "Руслан и Людмила". Гэтае ж выдавецтва ў 1988 годзе выпускае мініяцюрна-факсімільнае выданне з арыгінала 1837 года рамана ў вершах "Евгений Онегин".

Ленінградскім ізакамбінатам "Мастак РСФСР" было факсімільна ўзноўлена нямала выданняў у ілюстрацыях і малюнках вядомых мастакоў.

У ліку вышэйназваных факсімільных выданняў паэма А.С.Пушкіна "Медный всадник" (з выд. 1923 года), "Пиковая дама" (з выд. 1911 года) з ілюстрацыямі і малюнкамі А.П.Бенуа, "Казначейша" М.Ю.Лермантава ў афармленні мастака М.В.Дабужынскага (з выд. 1914 года). У 1985 годзе з малюнкамі вядомага мастака Д.Н.Кардоўскага выходзіць факсімільнае выданне камедыі А.С.Грыбаедава "Горе от ума" (з выд. 1913 года). Адным з найкаштоўнейшых помнікаў графікі лічыцца кніга Л.М.Талстога "Хаджи-Мурат" у ілюстрацыях Е.Е.Лансарэ (з выд. 1916 года), "История одного города" М.Я.Салтыкова-Шчадрына з малюнкамі Самахвалава ( выд. 1935 года).

Волга-Вяцкае кніжнае выдавецтва ў 1984 годзе (да 170-годдзя з дня нараджэння М.Ю.Лермантава перавыдае выдадзеную пры яго жыцці кніжку вершаў з факсімільным узнаўленнем тэкста.

Выдавецтва "Навукова думка" (Кіеў) у 1989 годзе выдае на ўкраінскай мове твор Т.Р.Шаўчэнкі "Большая книжка" — гэта новае факсімільнае выданне рукапіснага зборніка яго вершаў.

Беларускі выпуск факсімільных выданняў пачаўся зусім нядаўна.Але за гэты невялікі прамежак часу нямала выдадзена такіх выданняў, якія сёння складаюць наш нацыянальны гонар, дый не толькі нацыянальны, яны зрабілі немалы ўклад у сусветную культуру.

У пачатку 80-х гадоў беларускі народ адзначыў стогадовы юбілей заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры Якуба Коласа і Янкі Купалы. З гэтай нагоды выдавецтва "Мастацкая літаратура" (Мінск) у 1982 годзе факсімільна ўзнаўляе "Жалейку" Янкі Купалы і кніжку Якуба Коласа "Песні жальбы". "Жалейка" Янкі Купалы выйшла ў свет вясной 1908 года ў выдавецтве "Загляне сонца і ў наша аконца". З першага выдання мала збераглося экземпляраў "Жалейкі", бо яна выдавалася малым тыражом. Факсімільнае выданне падрыхтавана з экземпляраў, якія захоўваюцца ў літаратурных музеях Янкі Купалы і Якуба Коласа. Дзякуючы гэтаму выданню "Жалейкі", сёння мы маем магчымасць атрымаць тую ж самую кнігу, якая выйшла ў пецярбургскай друкарні К.Пянткоўскага. Кніжка "Песні жальбы" Якуба Коласа ўбачыла свет у 1910 годзе ў Вільні. Гэта першая кніга класіка беларускай літаратуры, выдатнага народнага песняра, якая глыбока раскрыла душу народную, расказала пра яго долю, паказала веліч зямлі беларускай. Факсімільнае выданне гэтай кнігі падрыхтавана з экземпляраў, якія захоўваюцца ў Літаратурным музеі Якуба Коласа, Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва РБ, Дзяржаўнай нацыянальнай бібліятэцы.

Гэтым жа выдавецтвам у 1981 годзе факсімільна ўзнаўляецца адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў Максіма Багдановіча "Вянок", які адразу стаў класікай. Зборнік "Вянок" выйшаў у 1913 годзе ў Вільні у друкарні Марціна Кухты малым тыражом і даўно стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. Сёння Вы маеце магчымасць з ім пазнаёміцца на выставе.

У 1990 годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" факсімільна выпускае першую кнігу Францішка Багушэвіча "Dudka bialaruskaja", якая была напісана лацінкай і ўпершыню выдадзена ў Кракаве ў 1891 годзе. Выданне падрыхтавана па экземпляру, які захоўваецца ў аддзеле рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі г.Вільнюса.

З нагоды 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны — асветніка, пісьменніка, мастака эпохі Адраджэння — выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" у 1990 годзе факсімільна ўзнаўляе Біблію, выдадзеную Ф.Скарынам у 1517-1519 гадах у трох тамах. Біблія, выдадзеная Скарынам у Празе на мове. блізкай да мовы свецкай старажытнабеларускай пісьмовасці, зразумелай простым людзям таго часу, застаецца даступнай і для сучаснага чытача.

У 1991 годзе выдавецтва "Навука і тэхніка" ўзнаўляе факсімільнае выданне першай беларускай газеты "Наша доля". гэтым жа выдавецтвам у 1992 годзе факсімільна ўзнаўляецца газета "Наша ніва" — першая беларуская газета з малюнкамі. выпуск 1. 1906-1908 гадоў.

Факсімільныя выданні. аб якіх тут ішла гаворка. дають нам магчымасць дакрануцца да спадчыны. якую на працягу многіх стагоддзяў стварала чалавецтва.

*Л.П.Міцкевіч,*
*заг. аддзела рэдкіх і каштоўных кніг*

# Адкуль з'яўляецца жорсткасць? Куды знікае культура?

Так здарылася, што сёлета ў нашай школе не адзначалі традыцыйныя "мужчынскае" і "жаночае" святы — 23 лютага і 8 сакавіка. Але напісаць гэтыя "несвяточныя занатоўкі" мяне прымусілі падзеі, якія адбыліся напярэдадні і падчас тых святаў.

У лютым сваімі сябрамі быў забіты вучань трэцяга класа. Яго забойства моцна ўразіла ўсю школу. Ва ўсіх класах пачаўся збор грошай на пахаванне, як раптам — новае здарэнне. У адным з першых класаў вучань паспрабаваў украсці ў настаўніцы сабраныя на пахаванне грошы.

Гэтыя здарэнні прымусілі многіх у нашай школе сур'ёзна задумацца. Адкуль у шасці-васьмігадовых дзяцей, характар якіх яшчэ канчаткова не сфармаваўся, столькі жорсткасці і абыякавасці да чалавечага жыцця? Адкуль з'яўляецца неспатольная прага да "лёгкіх" грошай і жаданне любым коштам жыць за кошт іншых людзей? Што да гэтага спрычынілася — агульны ўплыў грамадскага надвор'я, кепскае хатняе выхаванне або прыроджанае парушэнне псіхікі? А можа, ўсё разам і з'яўляецца сапраўднай прычынай "беспредела" ў школьных жыцці, прыклады якога назіраюцца ўсё часцей? Хіба не адлюстроўвае школа, як у люстэрку, усіх тых жудасных працэсаў у "дарослым" жыцці, нарошчванне агрэсіўнай жорсткасці ў нашым грамадстве?

Тым не менш, цалкам бяследнымі для вучняў нашай школы дні "мужчынскага" і "жаночага" святаў не прайшлі. Так, 23-га лютага да нас завіталі курсанты з міліцэйскай акадэміі. каб распавесці пра сваю нялёгкую службу. Аднак з-за таго, што па ўзросту будучыя міліцыянеры амаль не адрозніваліся ад старшакласнікаў, прапагандысты з іх атрымаліся не надта выдатныя. Наведаўшы наш клас, будучыя работнікі праваахоўных арганаў збянтэжана чырванелі пад пільнымі позіркамі трыццаці вучаніц, якім ўсё ж блытана распавялі, што вучоба ў міліцэйскай акадэміі — справа для сапраўдных мужчын, пасля чаго паспешліва рэцыравалiся.

Справа ў тым, што ў нашым класе толькі чацвёра хлопцаў — характэрная для старэйшых класаў з'ява. Таму дзяўчаты вырашылі самі іх павіншаваць і "скінуцца" на падарункі. Аднак і гэта аказалася няпроста, бо некаторым дзяўчатам не спадабалася ідэя "складчыны". Але сапраўдная прычына не ў цяжкім фінансавым становішчы іх бацькоў, а ў непазбыўным раз'яднанні калектыву. Мажліва, такое разлучэнне ўласціва складанаму крытычнаму ўзросту, калі кожны юнак робіцца максімалістам, павышаючы патрабаванні да свайго асяроддзя. Напэўна, гэтым і тлумачыцца тое, што некаторыя нашы аднакласніцы не захацелі марнаваць час на такое глупства, як віншаванне аднакласнікаў.

Вядома, дзяўчаты сталеюць раней за хлопцаў. Кола іх поглядаў на жыццё значна пашыраецца, а праблемы робяцца больш істотнымі ў той час, як хлопцы яшчэ не пакутуюць ад кахання і мяжой іх мары з'яўляецца пачак добрых цыгарэт. У апошніх класах такая духоўная розніца значна менш адчуваецца, і хлопцы спрабуюць заваяваць сэрцы аднакласніц, якія паблажліва ставяцца да равеснікаў, бо самі лічаць за лепшае сустракацца са старэйшымі за сябе мужчынамі.

Нашы чатыры рыцары таксама павіншавалі, хаця без прыгожых пажаданняў і крыху нязграбна, аднакласніц 8-га сакавіка. Таму можна сцвярджаць, што адносіны паміж хлопцамі і дзяўчатамі ў нашым класе даволі цёплыя.

На жаль, клас з такім узроўнем узаемаадносін можна назваць не звычайным, а ўзорным. Бо ў некаторых іншых класах нашай школы паміж хлопцамі і дзяўчатамі адбываецца сапраўдная вайна. Абраза і прыніжэнне гонару тут зрабіліся звычайнай з'явай.

Наўрад ці такая атмасфера спрые поспехам у вучобе і добраму настрою, затое моцна ўплывае на фармаванне характару школьнікаў. Наўрад ці ў "дарослым" жыцці яны будуць ставіцца памяркоўна да іншых людзей, калі свае ж аднакласнікі прывучылі іх заўсёды быць жорсткімі і злымі.

Сучасная школа не надта спрые таму, каб яе выхаванцы навучыліся паважаць погляды і меркаванні іншага чалавека не залежна ад таго, старэйшы ці маладзейшы ён за цябе, хлопец ён або жанчына. І тут не варта шукаць толькі віну адміністрацыі школы ці настаўнікаў. Вялікі ўплыў аказвае і эталон агульных паводзін у грамадстве, дзе пануе закон: "Чалавек чалавеку — воўк".

Неаднойчы, крочачы школьным калідорам, даводзіцца чуць штодня брудную лаянку паміж вучнямі, якая ледзь-ледзь не перарастае ў бойку. Мала прыемнага і ў тым, каб штодня назіраць за старшакласнікамі, якія па заканчэнні заняткаў з крыкам расштурхоўваюць локцямі малалеткаў, каб толькі хутчэй выскачыць на вуліцу. Або дзяўчаты, якія выбіваюцца на ганак, пачынаюць мацяршчыць.

У нашай школе вучні ходзяць "смаліць" на вуліцу. У некаторых жа іншых школах, як чула, "смаляць" проста ў прыбіральнях, а калі настаўнік зробіць заўвагу, дык могуць і на тры літары паслаць.

Атрымліваецца замкнёная кола: чым ніжэй узровень культуры ў нашых падлеткаў. тым болей жорсткасці і агрэсіўнасці пануе ў маладзёжным асяроддзі. Але і злосць, якой апошнім часам зашмат назапасілася ў хлопцаў і дзяўчатах, не спрыяе развіццю культуры ўзаемаадносін. І гэтая агульная варожасць нарастае нібы снежны ком.

Дзе ж рэальнае выйсце з такой жудаснай сітуацыі? На маю думку, яно — у карпатлівай працы па выхаванні цярплівасці, узаемапавагі і элементарнай культуры. па вяртанні ў грамадства ўсяго таго карыснага ў культуры паводзінаў, што было страчана ў ліхаманкавыя гады "постперабудовы".

Думаю, зусім бы не пашкодзіла, каб у нашых школах болей часу ўдзялялі выкладанню правілаў этыкету і добрых манераў. Вялікай шкоды ад такіх змяненняў у навучальным раскладзе ніхто не адчуў бы. затое вельмі хутка адчулі б практычную карысць. Думаю, што такія мерапрыемствы дый шэраг іншых аказалі б станоўчы ўплыў не толькі на паводзіны школьнікаў, але і на многіх дарослых, а ў выніку ў выйгрышы аказалася б усё нашае грамадства.

*Наталля Сарока*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.
Газета падпісана ў друк у 12.00.

16 МАЯ
Зак. 2006.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.

В.а. рэдактара
Т.М. Казак